# ПЕРШАЕ, ВЯЧЭРНЯЕ, ПАСЯДЖЭНЬНЕ.

*(22 лістапада 1927 г.).*

*Зьезд адкрывае сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б т. Кнорын (а 6 гадзіне 45 хвіл.).*

## Прамова тав. Кнорына.

**Кнорын.** Таварышы, на XI зьезьдзе камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі да гэтага часу прыбыло 344 дэлегаты з пастаноўчым голасам і 220—з дарачным голасам, якія прадстаўляюць усяго 23.735 членаў і 11.392 кандыдаты, а ўсяго—35.127 членаў і кандыдатаў нашае партыі, г. зн. поўны склад камуністычнай партыі Беларусі. Такім чынам, правамоцнасьць нашага зьезду поўная; на гэтай падставе дазвольце XI зьезд камуністычнай партыі абвясьціць адкрытым. (Бурныя воплескі).

Таварышы, у цяжкай барацьбе за перамогу міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі і за справу сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, у пэрыяд між X і XI зьездамі КП(б)Б, мы страцілі аднаго з лепшых нашых працаўнікоў, члена Цэнтральнага Камітэту камуністычнай партыі Беларусі тав. Апанскага, і дзесяткі членаў нашай Усесаюзнай камуністычнай партыі, сотні рэвалюцыйных рабочых, сялян, адданейшых барацьбітоў за справу сацыялізму. Прапаную ўшанаваць іх памяць уставаньнем. (Усе ўстаюць).

Таварышы, за намі гады цяжкай барацьбы і працы. За гэты год міжнародныя адносіны, адносіны паміж Савецкім Саюзам і капіталістычнымі дзяржавамі значна пагоршыліся. З кожным днём усё больш і больш ясна становіцца, што контр-рэвалюцыйная вайна супроць Савецкага Саюзу становіцца ўсё больш і больш магчымай і няўхільнай. Гэтая акалічнасьць змусіла камуністычную партыю бальшавікоў Беларусі за мінулы пэрыяд накіраваць значную частку сваёй ўвагі на растлумачэньне шырокім гушчам працоўных міжнароднага становішча нашае краіны і таксама накіраваць значную частку нашае ўвагі і нашых сіл на справу арганізацыі абароны нашае краіны, на справу садзейнічаньня Чырвонай арміі. Але наша сіла ня толькі ў Чырвонай арміі; мы маем на сваім баку падтрыманьне ўсіх рабочых, усяе асноўнае масы сялянства; мы маем на сваім баку падтрыманьне самых шырокіх гушчаў працоўнага насельніцтва нашага краю. Мы маем на сваім баку падтрыманьне рэвалюцыйнага міжнароднага пралетарыяту. Разам з міжнародным пралетарыятам, пад кіраўніцтвам Усесаюзнай камуністычнай партыі, Савецкі Саюз пераможа ў надыходзячай вайне і адваюе права на сацыялістычнае будаўніцтва ў нашым краі.

У сувязі з агульным міжнародным становішчам, у сувязі з падрыхтоўваемай контр-рэвалюцыйнай вайной супроць Савецкага Саюзу, нам давялося перажыць шэраг труднасьцяй у нашай унутранай працы, у нашай працы ў галіне гаспадарчага будаўніцтва і арганізацыі рабочых мас. Але мы, пры поўным падтрыманьні ўсяе рабочае клясы

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Беларусі, гэтыя труднасьці перамаглі, мы будавалі і будуем новае сацыялістычнае грамадзтва. Мы маем за гэты год значныя посьпехі ў галіне ўзьняцьця нашай прамысловасьці. Мы маем за гэты год значныя посьпехі ў галіне ўзьняцьця сельскае гаспадаркі і ў галіне арганізацыі сялянскай беднаты. Мы маем буйнейшыя дасягненьні ў галіне вырашэньня нацыянальнага пытаньня, будаўніцтва культуры, узьняцьця ўсіх нацыянальнасьцяй Беларусі на больш культурны і палітычны ўзровень. Мы маем асабліва буйныя посьпехі ў справе ўзьняцьця палітычнае актыўнасьці шырокіх мас беларускага працоўнага насельніцтва, беларускіх рабочых і сялян. З году ў год, з месяцу ў месяц мы расьцем і мацнеем. Толькі здраднікі справе Кастрычнікавай рэвалюцыі, толькі ныцікі і ліквідатары могуць ня бачыць нашых посьпехаў і нашых дасягненьняў. Трацкісцкая апазыцыя страціла здольнасьць бачыць наша будаўніцтва і нашы посьпехі. Трацкісцкая апазыцыя, ныючая і хныкаючая, стала сур'ёзьнейшай перашкодай у справе сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым краі.

Таму значная частка нашае ўвагі за мінулы пэрыяд павінна была быць накіравана на барацьбу з трацкісцкай апазыцыяй, як з новай формай меншавізму ў шэрагах нашай Усесаюзнай камуністычнай партыі.

Наша Ўсесаюзная камуністычная партыя і камуністычная партыя Беларусі перамаглі гэту небясьпеку, пакончылі, зруйнавалі ўшчэнт трацкісцкую апазыцыю ў нашых шэрагах.

Мы, таварышы, мелі за гэты пэрыяд як адну з важнейшых задач, стаячых перад намі, задачу барацьбы за палепшаньне становішча рабочае клясы, за ўзьняцьце рабочае клясы на больш высокі ўзровень матар'яльнага становішча і культурнасьці. Мы можам сёньня сказаць, што ў гэтай галіне мы маем даволі значныя дасягненьні. Толькі малаверы, ліквідатары ня могуць бачыць гэтых дасягненьняў нашае партыі.

Аднэй з важнейшых задач, якая стаяла ў працягу гэтага пэрыяду перад намі, была барацьба за ленінскае адзінства нашай партыі, барацьба супроць арганізатараў новай трацкісцкай партыі, барацьба супроць малавераў, ліквідатараў, супроць ныцікаў, перараджэнцаў, супроць усіх, хто са ступенькі на ступеньку пераходзіць ад пазыцыі міжнароднага бальшавізму, ад пазыцыі ленінізму, да пазыцыі меншавізму, да пазыцыі сацыял-здрадніцтва.

Дзякуючы ўпартай працы нашай арганізацыі па растлумачэньні масам ленінскага вучэньня і шляхоў сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым краі, мы аб'ядноем вакол сябе ў якасьці верных прыхільнікаў ленінскага вучэньня, у якасьці верных і трывалых барацьбітоў за справу Кастрычнікавай рэвалюцыі, за справу міжнароднага пралетарыяту больш 99 проц. усяе нашае арганізацыі. Нікчэмная купка паасобных апазыцыянэраў-трацкістых аказалася зусім ізаляванай у нашай арганізацыі. Трацкісцкая апазыцыя не карысталася і не карыстаецца ў нашай арганізацыі ніякім уплывам, мы можам сказаць, што трацкісцкая апазыцыя не карыстаецца і не карысталася ніякім уплывам у шэрагах нашага камсамолу, які ў поўнай меры ідзе сумесна з камуністычнай партыяй, працуючы пад кіраўніцтвам партыі.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке